№ 40 (537)
Кастрычнік 2014 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

## 25 кастрычніка – дзень святога Марціна, свята млынароў



*Сівеў маркоты сын-палын*
*На ўсіх шляхах расстайных.*
*Над Свіслаччу грукоча млын,*
*Аж берагі хістае.*
*Сем грозных колаў у млыне*
*(Хоць трохі сцішыў гул бы),*
*Каменняў поле заглыне –*
*Намеле пытлю гурбы.*

*Млынар – асілак і вядзьмар,*
*Дыхне – шумяць прысады.*
*Ён лїўні і грымоты з хмар*
*Маланкай выкрасае.*
*Разлогі цемра захлыне,*
*Цішэе над барамі –*
*Мянеск імчыцца на млыне,*
*Дружыну набірае.*

*Сінеліся вачэй ільны,*
*Звінелі слоў крыніцы.*
*Запас Мянескаў – валуны*
*Пайшлі на камяніцы.*
*Гарэла ціхая зара*
*І задыхаўся горан.*
*Няма Мянеска-млынара –*
*Назваўся Менскам горад.*

*З верша Рыгора Барадуліна «Мянеск»*

## У нумары:

☞ Выстаўка: *ВКЛ і беларуская картаграфія* – *стар. 2*

☞ Повязі: *XVIII ст., магілёўскі мешчанін у Кіеве* – *стар. 4*

☞ Памяць: *лёс магільнага помніка* – *стар. 5*

## На тым тыдні...

✓**14 кастрычніка** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску адкрыліся дзве выстаўкі – «**Кунсткамера**» і «**Рэканструкцыя № 1**».

У праекце «Кунсткамера» Аляксандр Веледзімовіч гуляе з гледачом у загадкі і шукае межы сучаснага разумення фатаграфіі. Калі жывапіс больш рэалістычны за фатаграфію? Ці заўсёды фатаграфія гаворыць пра мінулае? Як сфатаграфаваць нерухомы рух? Праект «Рэканструкцыя № 1», якім апякуюцца Аляксей Шлык і Алег Шобін, узнаўляе два архітэпічныя макракосмасы: мужчынскі і жаночы, якія сёння часта праблематызуюцца шматпалярнасцю сучаснай культуры.

Абедзве выстаўкі зладжаныя ў межах Месяца фатаграфіі ў Мінску.

✓Акурат у Дзень маці, **14 кастрычніка**, у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адбылася вечарына **«Двайной красы аблік ядыны...»**, прысвечаная маці паэта, Марыі Апанасаўне Багдановіч. Спецыяльна да імпрэзы была падрыхтавана выстаўка, прысвечаная жанчынам, якія яго выхоўвалі.

✓**15 кастрычніка** быў распачаты **праект «Літаратурная серада ў музеі Петруся Броўкі»**, арганізаваны музеем разам з парталам Textura.by (яго стваральнікі – Андрэй Фаміцкі і Алесь Емельянаў-Шыловіч). Новы праект – гэта своеасаблівая пляцоўка для знаёмства з сучаснай беларускай і замежнай літаратурай.

✓**15–16 кастрычніка** ў Магілёве адбыўся трэці **Міжнародны форум «Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства»**, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Літвы, Расіі, Румыніі, Францыі. Галоўнай мэтай форуму з'яўляецца захаванне традыцыйнай культуры.

У праграме форуму значыліся навукова-практычная канферэнцыя «Фальклор і абрадавыя традыцыі як аўтэнтычныя праявы багацця лакальных культур», экспазіцыя навукова-вытворчага прадпрыемства беларускіх народных рамёстваў «Скарбніца», на якой прадстаўленыя рэканструкцыі традыцыйных беларускіх народных касцюмаў розных рэгіёнаў краіны, выстаўка працаў майстроў па ткацтве ды шэраг іншых мерапрыемстваў.

✓**16 кастрычніка** Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы прэзентаваў **філасофска-паэтычную інсталяцыю «Шлях паэта» Паўла Вайніцкага і Алены Златкевіч.** Аўтары абралі сталь і шкло, каб стварыць канцэптуальны арт-аб'ект, прысвечаны апошнім дням паэта.

Шкляны вір арганічна ўключыў элементы музейнай калекцыі: аўтэнтычныя фрагменты інтэр'ера 414-га нумара гасцініцы «Масква», люстраныя дзверы, у празрыстай глыбіні якіх у апошні раз адбілася аблічча паэта, прыступкі і парэнчы лесвіцы – сведкі трагедыі 28 чэрвеня 1942 года, калі ў Маскве абарвалася жыццё паэта. Пасля яго гібелі засталіся пытанні, адказы на якія дагэтуль не знойдзеныя.

✓**18 кастрычніка** ў Вілейцы адбылася **канферэнцыя «Першая сусветная вайна ў гістарычных лёсах Еўропы»**, у якой узялі ўдзел прадстаўнікі Беларусі, Украіны, Польшчы, Расіі, Вялікабрытаніі, Славеніі, Венгрыі, Казахстана і Кітая. Пад час мерапрыемства ўдзельнікі канферэнцыі наведалі мемарыяльны комплекс памяці Першай сусветнай вайны ў вёсцы Заброддзе Вілейскага раёна, дзе праходзіла лінія фронту.





*Выступае І. Катвіцкая*

✓**Канцэрт Ірэны Катвіцкай «Этна Фантазіі: белыя колеры свету»** адбыўся **18 кастрычніка** ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. І. Катвіцкая – этнаспявачка і вядомы інтэрпрэтатар беларускага фальклору. Можна было пачуць раяль у традыцыях эпохі мадэрна і вакал, этнічна насычаны фарбамі ад шэпту да крыку, ад калыханкі да гарачай малітвы. Да «Этна Фантазіі» далучаюцца і юныя музыкі. Так, гэтым разам гасцямі праекта сталі вакальнае этна-трыа «Вера, Патрыцыя і Алесь» і Лера Пажарыцкая (скрыпка).

## Круглы стол

Захаванне і развіццё традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў у прасторы сённяшніх сацыяльна-эканамічных працэсаў – адна з галоўных задачаў сучаснага грамадства. Фармаванне нацыянальнай свядомасці беларускага народа абапіраецца на патрыятычнае выхаванне кожнага з яго прадстаўнікоў.

«Калі мы развучымся гаварыць на беларускай мове, мы перастанем быць нацыяй», – заявіў у сваім выступленні Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

З мэтай вызначэння шляхоў патрыятычнага выхавання школьнікаў, навучэнскай і працоўнай моладзі, а таксама дзеля ўдасканальвання дзейнасці аматарскіх калектываў Кастрычніцкага раёна г. Мінска сродкамі розных відаў традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў адбудзецца **круглы стол «Патрыятычнае выхаванне асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў».**

Удзельнікі круглага стала:

- **Валодзіна Таццяна Васільеўна,** загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, дацэнт, доктар філалагічных навук;
- **Варфаламеева Тамара Барысаўна,** старшы навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, этнамузыколаг, кандыдат мастацтвазнаўства;
- **Рагуля Аляксей Уладзіміравіч,** прафесар кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь;
- **Лозка Алесь Юр'евіч,** дацэнт, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай школы», кандыдат філалагічных навук;
- **Гальпяровіч Навум Якаўлевіч,** галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі замежнага вяшчання «Радыё "Беларусь"» Нацыянальнай Белтэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, паэт, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі;
- **Гілеп Уладзімір Аляксандравіч,** старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры», галоўны рэдактар газеты «Краязнаўчая газета»;
- **Ровенскі Дзмітрый Дзмітрыевіч,** мастацкі кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь фальклорнага ансамбля «Дударыкі» гімназіі № 14 г. Мінска, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, народны музыка Расіі.

**У праграме**

1. Панарама вопыту «Беларуская традыцыйная культура ў творчай дзейнасці выхаванцаў ЦДАДіМ "Ветразь"» (15.00 – 15.20).

**2.** Прэзентацыя сістэмы выкарыстання традыцыяў народнай педагогікі і аўтэнтычных формаў беларускай культуры на занятках фальклорнага калектыву «Мілавіца» (кіраўнік Марыя Васільеўна Снітко; 15.20 – 16.00).

**3.** Круглы стол «Патрыятычнае выхаванне асобы сродкамі традыцыйнага народнага мастацтва беларусаў». Абмеркаванне і прыняцце рэзалюцыі (16.00 – 17.00).

***Пытанні да абмеркавання***

– Нацыянальная мова як педагагічны фактар патрыятычнага выхавання асобы, фармавання духоўнага светагляду навучэнцаў.

– Праблема захавання беларускай народнай культурнай спадчыны ва ўстановах адукацыі.

– Выкарыстанне сродкаў фальклорнага мастацтва ў сучаснай сістэме адукацыі і выхавання.

– Педагог як носьбіт традыцыйнай народнай культуры і мастацтва.

**Запрашаем да супрацоўніцтва!**

Круглы стол пачне працу 6 лістапада а 15-й гадзіне ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» г. Мінска па адрасе: вул. Чкалава, 1-4.

**Кантакты.** Валянціна Мікалаеўна Румава, дырэктар ЦДАДіМ «Ветразь» г. Мінска, тэл. 220-73-06; Святлана Аляксандраўна Чэмецева, загадчык аддзялення вакальнага мастацтва і музычнай творчасці, тэл. 216-22-63.

## Нашы спачуванні



12 кастрычніка памёр выдатны фразеолаг, даследчык культуры беларускага маўлення доктар філалагічных навук, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы **Іван ЛЕПЕШАЎ**. Ён аўтар болей як сарака кніг па беларускай філалогіі, асоба з няпростым лёсам (пра яго «Краязнаўчая газета» падрабязней пісала ў 2009 годзе з нагоды ягонага 85-годдзя). З 1971 года Іван Якаўлевіч непарыўна звязаны з гродзенскім універсітэтам; апошнім часам на ўласныя сродкі выдаваў свае працы.

Ад пачатку выдання нашай газеты І. Лепешаў быў яе чытачом і аўтарам.

Рэдакцыя «Краязнаўчай газеты» і супрацоўнікі Беларускага фонду культуры смуткуюць з прычыны смерці прафесара Лепешава і выказваюць шчырыя спачуванні родным і блізкім спачылага.

# Вобразы гістарычнай памяці

***Нядаўна непрыкметна ў Мінску адкрылася новая выставачная пляцоўка. Невялікую галерэю стварыў Беларускі камітэт ІКАМОС. І адразу ж адкрылася першая выстаўка.***



*На пярэднім плане – мапа А. Віда*

Вось што пра гэта распавёў сябра беларускага ІКАМОСа Ігар Раханскі:

– У свой час беларускі камітэт выступіў з ініцыятываю стварэння камерцыйнай арганізацыі, якая займалася б дзейнасцю, скіраванай на ахову і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны. Увага павінна надавацца не толькі нерухомай, але і рухомай спадчыне. Была створаная прыватная арганізацыя ў вёсцы Гальшаны Ашмянскага раёна «НЕФ-праект». Мы на камерцыйнай аснове, да прыкладу, выконваем рэстаўрацыйныя праекты (сярод іх удзел у аднаўленні палаца ў Красным Беразе Жлобінскага раёна, Мірскага замка). Цяпер мы здолелі арэндаваць памяшканне, дзе маглі б знаёміць зацікаўленых з багаццем айчыннай культурнай спадчыны. І цяпершняя выстаўка каштоўная тым, што мы пачалі сваю дзейнасць у гэтым рэчышчы. Яна азначае пачатак новага этапу і ў дзейнасці ІКАМОСа. З'явілася ў сталіцы нашай дзяржавы новая пляцоўка, дзе можна абмяркоўваць праблемы захавання спадчыны.



*Э. Куфцэрын распавядае пра мапы*

Пра выстаўку «Вялікае Княства Літоўскае на геаграфічных мапах», што нядаўна адкрылася і мае падзагаловак «Візуальныя вобразы гістарычнай памяці», распавёў калекцыянер Эдуард Куфцэрын.

– Сучасныя тэхналогіі дазваляюць перавыдаць старыя мапы (карты) у такой якасці, што можна расчытаць многія тапонімы, разглядзець дробныя дэталі; і перавыданне, натуральна, атрымліваецца лепшай якасці. На выстаўцы я прапаную паглядзець некалькі перавыданняў. Асобна хацелася б звярнуць увагу на карту, якая называецца «Масковія і Белая Русь з часткамі, якія не ўваходзяць у Еўрапейскую Сарматыю». Далей ідзе апісанне, што на ёй адлюстраванае. Гэта першая на той час карта Масковіі. Да таго карысталіся картамі Пталемея і вытворнымі ад іх, а тэрыторыя сучаснай заходняй Расіі пазначалася як невядомыя землі (там вадзіліся драконы, белыя плямы, «Тартарыя»), дзе адвольна маглі паставіць пару гарадоў. Еўропа заканчвалася на Смаленску. Гэтая ж карта ўпершыню паказала тэрыторыю далей. Ёсць тут шмат іншых цікавостак. Карта арыентаваная на ўсход. Выдадзеная яна на лацінe. Тут змешчаная першая выява Аршанскай бітвы (якая адбылася незадоўга да выдання карты, стала вядомаю за межамі ВКЛ, ёсць надпіс «Канфлікт 1514 года»). На сёння гэта першая вядомая карта сугуба літоўская (г. зн. беларуская), якую стварыў ліцьвін Антоній Від. Акрамя мяне ні картаю, ні асобаю картографа ніхто не займаўся. Я, да жалю, не прафесійны гісторык. Але вось што ўдалося даведацца. Першае выданне гэтай карты было ажыццёўлена ў 1535 годзе, тут дэманструецца копія з перавыдання 1539-га. Мне задаюць пытанне, чаму першаю не стала карта ўласна Літвы. Ішла вайна, Васіль III быў непрымірымым праціўнікам Літвы і Польшчы. Вяліся актыўныя ваенныя дзеянні. А пасля смерці Васіля многія ўцякаюць з Масковіі да сваіх ворагаў і падбіваюць Жыгімонта на вайну. Вядома ж, для поспеху кампаніі патрэбныя звесткі пра геаграфію: паселішчы, адлегласці, броды. І апроч вялікай колькасці дадатковай інфармацыі мы бачым размяшчэнне гарадоў, ардынскія сталіцы, а галоўнае – абарончыя пасты Масковіі, дзяржаўныя межы.

***Такім чынам, названая карта можа лічыцца першаю ліцьвінскаю (беларускаю) картаю, створанаю ліцьвінам, лічыць Э. Куфцэрын. Гэты ды іншыя экспанаты можна пабачыць у выставачнай галерэі, што знаходзіцца па першым паверсе будынка, у якім знаходзіцца рэдакцыя «Краязнаўчай газеты», штодзённа да 3 лістапада з 10 да 19 гадзінаў. А пра асобу А. Віда і першую беларускую карту мы мяркуем распавесці асобна.***

*Уладзімір ПУЧЫНСКІ,*
*фота аўтара*

*(Заканчэнне.*
*Пачатак у №№ 38–39)*




## Час прыгону

Шведская віхура змянілася чарговым перыядам адносна мірнага сялянскага жыцця, якое нельга было назваць ціхім. Прыгон, барацьба шляхты паміж сабою, паходы рускага войска ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай, рух Напалеонаўскай арміі на Маскву – усё гэта было чарговым цяжкім выпрабаваннем для жыхароў Беларусі, якое нашыя продкі вытрымалі, нягледзячы на вялікія страты, параўнальныя з наступствамі Вялікай Айчыннай вайны. Цяжкі след гэтыя падзеі пакінулі і на твары Васілевічаў, і ў жыцці яе жыхароў, але сёння разгледзець іх неўзброеным вокам немагчыма.

Пасля вайны 1812 г. валадарамі вёскі сталі паны Дубашынскія. Ва ўрочышчы Падлужжа яны пабудавалі палац, аскепкі якога і сёння яшчэ захоўваюцца ў памяці васілёўцаў. У сувязі з адменаю прыгону ў 1861 г. паны паступова страчвалі права распараджацца сялянамі, вяскоўцы переставалі быць уласнасцю і пачалі выкупляць надзелы зямлі, якую спрадвеку абраблялі. У гэты ж час на паўднёвым ускрайку Васілевічаў з'явіліся так званыя Батракі, утвораныя некалькімі сем'ямі, што працавалі на Дубашынскіх і мелі за працу невялікі кавалак зямлі.

Батрак – наёмны працоўны ў сельскай гаспадарцы з ліку збяднелых сялянаў, меў невялікі кавалак зямлі або не меў яго зусім.

## Пабудова Парэцкай царквы

У тыя часы жыццё чалавека ішло ў згодзе з рэлігійнай вераю. Выхаднымі днямі сяляне ваколічных вёсак – Васілевічаў, Жылічаў, Нараставічаў, Парэчча, Бабынічаў, Задвор'я, Кастровічаў, Азарычаў, Шундроў, Пузевічаў і Нізоў – накіроўваліся ў Парэцкую царкву, слухалі настаўленні святара, а пасля службы абменьваліся апошнімі навінамі з блізкімі і сябрамі з іншых паселішчаў. Аднак у 1842 г. драўляная ўніяцкая царква згарэла. Невялікая капліча на парэцкіх могілках, у якой пачалі праводзіць службу, не магла змясціць усіх прыхаджанаў, таму многія перасталі яе наведваць. Сітуацыю вырашыў змяніць Аляксандар Паўлавіч Гарачка, які з 1855 г. стаў святаром прыхода.

Дзякуючы яму ў 1863 г. у Парэччы адкрылася народнае вучылішча, дзе займаліся таксама хлопчыкі з Васілевічаў і Жылічаў. Святар распачаў шырокую дзейнасць і арганізаваў сялянаў на будаўніцтва новых памяшканняў для школы і новай царквы. Васілёўцы Восіп Лявонцьевіч Харытончык і Сцяпан Фёдаравіч Герасімчык увайшлі ў склад створанага з гэтай мэтаю савета з 11-і чалавек. Спачатку ініцыятыву Гарачкі бюракраты не падтрымалі, але той шматлікімі просьбамі і пісьмовымі зваротамі здолеў змяніць сітуацыю на карысць сялянаў. На пабудову новай каменнай царквы былі выдзеленыя грошы, якіх хапала толькі на драўляную. Таму розніцу давялося кампенсаваць за кошт прыхаджанаў. Згодна з Аляксандрам Сямёнавічам Талерчыкам, аўтарам кніжкі пра вёску Парэчча, падрыхтоўчая праца па будаўніцтве царквы пачалася 17 чэрвеня 1865 г., а 20 верасня 1867 г. будаўніцтва было скончанае. Адкрыццё і асвячэнне храма прайшло ў прысутнасці амаль усіх жыхароў ваколіцы на Успленне, 15 жніўня 1867 г. (Успенне; па ст.ст. – **В.Г.**), якое на доўгія гады стала храмавым святам для прыхода.

## Рост вёскі і яго наступствы

Пасля адмены прыгоннага права пачаўся хуткі рост насельніцтва краю. Напрыклад, толькі ў 1870 г. жыхароў Слонімскага павета стала на 2 257 больш (6 141 нарадзіліся, памерла 3 884), а горада – на 333 (758 – 425 адпаведна). У 1891 г. у нашым павеце, найбуйнейшым у складзе Гродзенскай губерні, жыло 183 696 чалавек (на 1913 г. – 235 512), а ў Слоніме – 23 611. Такі шпаркі рост прыводзіў да шчыльнай забудовы як горада, так і вёскі. Дамы прыціскаліся да гаспадарчых пабудоваў, што ў выпадку пажараў, колькасць якіх штогод павялічвалася, прыводзіла да вялікіх матэрыяльных стратаў.

Неаднаразова чырвонае полымя вымушала і васілёўцаў брацца за сякеру і адбудоўваць вынішчанае агнём. Прыкладам такіх падзеяў, што змянялі аблічча вёскі, сетку яе вуліц, быў пажар 14 мая 1891 г., цяжар якога адчулі на сабе 10 сем'яў. Хлявы, адрыны, дамы... Пасля яго на папялішчы засталася толькі адна хата, якую агонь абмінуў. Кавалачкі зямлі, і так невялікія, драбіліся паміж бацькамі і сынамі, а тыя ўзводзілі новыя хаты побач, адна да адной. У выніку травеньскім днём, у час вельмі важнага для сялянскага жыцця перыяду, Аляксей, Дзяніс, Восіп і Антон Мальцы, Якаў і Міхаіл Харытончыкі, Якаў і Фёдар Герасімчыкі, Іван і Кандрат Сідаркевічы вымушаныя былі заняцца аднаўленнем сваёй разбуранай гаспадаркі.

Аднак гэта было не так проста зрабіць, як падавалася. Трэба было вытрымаць самае складанае – бюракратычную валакіту. Напачатку землямер Баярскі склаў план новай забудовы, з якім сяляне былі азнаёмленыя 22 мая і далі на яго згоду. Далей план і прашэнне перадалі ў Слонімскі з'езд міравых пасрэднікаў, які 20 чэрвеня прыняў пастанову накіраваць паперы ў канцылярыю губернатара. 18 ліпеня паперы апынуліся на стале губернатара, які пагадзіўся на адбудову, адпаведна складзенаму плану, у прысутнасці паліцыянта. 29 ліпеня паперы вярнуліся ў Слонімскі з'езд міравых пасрэднікаў, які накіраваў рэзалюцыю губернатара да слонімскага спраўніка. Толькі пасля гэтага сялянам было дазволена будаваць новыя хаты. Іх узвядзенне адбывалася на аснове прынятых у Расійскай Імперыі ў 1886 г. новых правілаў, што павінны былі забяспечыць пажарную бяспеку. Частка цяперашняй вуліцы Прырэчнай атрымала шырыню больш за 21 метр, а паабапал яе і ў дварах пачалі высаджваць пладовыя дрэвы. Пры пабудове дамоў і іншых будынкаў захоўвалі 20-метровыя прамежкі, а ад хлебных адрынаў – нават больш за 50 метраў. У далейшым да Першай сусветнай вайны новыя будынкі ў вёцы васілёўцы ўзводзілі згодна з гэтымі патрабаваннямі, але тая вайна зноў ператварыла вёску ў адно вялікае папялішча.

## Першая сусветная вайна ў жыцці васілёўцаў

Летам 1914 г. у Еўропе ўспыхнула чарговая вайна, якая ахапіла сваімі кіпцюрамі ўвесь свет. У верасні 1915-га яе гарматныя стрэлы дакаціліся да Слонімшчыны. У віхуры гэтых падзеяў апынуліся і васілёўцы, якіх прымусова эвакуявалі ўглыб Расійскай імперыі. Сведкам гэтага стаў Пётр Антонавіч Герасімчык, у будучым удзельнік партызанскага руху часоў Вялікай Айчыннай, на той момант – сямігадовы васілёвец. Ён быў малодшым у сям'і з дзевяці чалавек (бацька, маці і сямёра дзяцей). Старэйшы яго брат, Аляксей, быў мабілізаваны ў армію, як і дзясяткі іншых васілёўцаў, а іх сем'і пакінулі родную зямлю. Напачатку ўласным конным транспартам яны даехалі да Койданава, дзе прадалі жывёлін. Затым іх пагрузілі ў таварныя вагоны і давезлі да станцыі Шуміха Арэнбургскай губерні. Адтуль конямі прывезлі ў вёску Сажэно Чалябінскага павета той жа губерні. Пра тыя часы П. Герасімчык успамінаў: «Пакуль старэйшыя браты ўладкоўваліся на працу наймітамі да кулакоў, маці і я, як самы малодшы, хадзілі па свеце і прасілі падаць кавалачак хлеба, і так кармілі ўсю сям'ю».

У 1916 г. сям'я П. Герасімчыка пераехала жыць у горад Спаск Тамбоўскай губерні, адкуль 1 лістапада 1921 г. іх эвакуявалі як бежанцаў па дамове Савецкай Расіі з Польшчай на радзіму.

## Васілевічы ў складзе Другой Рэчы Паспалітай

У студзені 1922 г. васілёўцы вярнуліся ў родныя мясціны. Аднак сустрэча была вельмі цяжкаю: «Калі прыбылі на радзіму, уся вёска была спаленая, не засталося ніводнага жылога дома; холад, голад, хваробы, брушны і сыпны тыф і іншыя хваробы ад холаду і голаду. Выкопвалі зямлянкі і ў іх жылі».

Вёску давялося чарговы раз у яе гісторыі адбудоўваць наноў. Аб тым, як яна выглядала пасля аднаўлення, можна меркаваць на падставе карты 1934 г. (дадзеныя на ёй адпавядаюць 1930-у). Акрамя абрысаў вуліц, тут пададзеная і лічба двароў (колькасць сем'яў) у Васілевічах (61), Жылічах (30) і Батраках (20), якія ўтваралі адно паселішча. Васілевічы былі сярэдняй па памерах вёскай Слонімскага павета (напрыклад, у суседніх Нараставічах было 13 двароў, Міцькавічах – 17, Ганьках – 30, Парэччы – 88, Задвор'і – 44, Бабынічах – 140).

У час уваходжання Заходняй Беларусі ў склад Другой Рэчы Паспалітай яе жыхары (больш за 4 мільёны беларусаў) актыўна выступалі супраць урадавай палітыкі паланізацыі і пераўтварэння краю ў сыравінны прыдатак Польшчы. З гэтай мэтаю ствараліся нацыянальныя арганізацыі, сярод якіх была Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада, самая шматлікая ў гісторыі Беларусі партыя, якая налічвала каля 120 тысячаў сяброў. У яе шэрагах былі і васілёўцы. Пасля забароны БСРГ у 1927 г. многія з іх перайшлі ў Камуністычную партыю Заходняй Беларусі, спрабавалі адстойваць свае правы і дабівацца навучання ў Парэцкай школе на беларускай мове, але звычайна гэта заканчвалася цяжкімі штрафамі для бацькоў або накіраваннем на службу ў войска – для іх дзяцей. У такіх умовах сяляне ўспрымалі Другую Рэч Паспалітую як дзяржаву польскіх паноў, у якой нават выбары ў парламент пасля перавароту дыктатара Пілсудскага ў 1926 г. зрабіліся фарсам. Але яны правадзіліся, і на падставе спісаў выбаршчыкаў мы можам даведацца, якія прозвішчы былі распаўсюджаныя ў Васілевічах напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, памятаючы пра тое, што, нягледзячы на прозвішчы, жыхары Васілевічаў і суседняга Парэчча фактычна ўяўлялі адну вялікую сям'ю з рознай ступенню сваяцтва.


Васілёўцы. Пач. 1960-х гг.

У Васілевічах у 1935 г. было 266 дарослых (на жаль, такія спісы не падаюць колькасць дзяцей). Сярод іх на сённяшняй Прырэчнай вуліцы меліся наступныя прозвішчы: Герасімчык (83), Харытончык (30), Малец (27), Якімовіч (8), Пакінькаса (5), Талерчык (3), Сідаркевіч (2), Ферадко (1), у Жылічах і Батраках – Герасімчык (52), Сасноўскі (25), Харытончык (8), Скок (1) і Цыза (1). Многія з жыхароў вёскі і сёння носяць гэтыя прозвішчы і жывуць на зямлі продкаў.

***Верасень 1939 г. васілёўцы, як і іншыя сельскія жыхары краю сустрэлі з новымі надзеямі. Тады падавалася, што пачынаецца лепшае жыццё ў складзе аб'яднанай Беларусі. Аднак калі для адных то быў час шчаслівых спадзяванняў, для другіх гэта стала пачаткам Другой сусветнай вайны, полымя якой на доўгія тры гады ахапіла Беларусь у чэрвені 1941-га...***

*Васіль ГЕРАСІМЧЫК,*
*гісторык,*
*в. Васілевічы Слонімскага раёна*

*Добрий день! Надсилаю заміточку для «Краязнавчуй газети». Думаю, що вона буде цікавою читачам. Взагалі, в Інституці рукописів Наукової бібліотеци України я знайшов досить багато джерел по історії Білорусі, особливо церковної. Якщо газета зацікавиться, я думаю, що зміг би час від часу давати їй статті.*

# Беларус-кіянін

Гэтая справа з фондаў Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Украіны ў Кіеве была мною выяўленая выпадкова. Я няправільна напісаў у замове лічбу 193 замест 143, і пяць справаў мне прынеслі «не з тае оперы». Хаця, і не зусім так. Адна танюткая справа 1782 г., дасюль нікім не чытаная, прыцягнула маю ўвагу. Гэта была чалабітная Сцяпана Шпакоўскага, які крыху дапаўняе дакумент з канцылярыі кіеўскага намесніцкага праўлення.

З іх вынікае, што згаданы Сцяпан Цімафеевіч Шпакоўскі нарадзіўся ў 1744 г. у сям'і мешчаніна г. Магілёва Івана Шпака і ягонай жонкі Марыі Сямёнаўны (у дзявоцтве – Пракапоўская). Калі памёр бацька, Сцяпану Шпаку было 14 або 15 гадоў (дакументы падаюць па-рознаму), і ён вырашыў пакінуць бацькоўскі дом. Са сваімі землякамі-магілёўцамі ён выпраўляецца на багамолле ў Кіеў – агульнапрызнаны цэнтр праваслаўя ва Усходняй Еўропе. Кіеў юнаку спадабаўся, і ён застаўся на год служыць там у мясцовага мешчаніна Івана Данца. Адслужыўшы гэты тэрмін, Сцяпан пераехаў у Нежын (вядомы ў Украіне XVII – XVIII стст. цэнтр рамяства і гандлю), дзе служыў у розных купцоў два гады. Але маладога чалавека цягнула ў Кіеў. І ён вярнуўся сюды ў 1761 або ў 1762 г. Тут ён наняўся на службу да кіеўскага мешчаніна Гната Квяткоўскага, у якога заставаўся пад час напісання чалабітнай.

Відаць, справы ішлі няблага. Ён пачаў называцца Шпакоўскім, пабраўся шлюбам з кіянкаю Арынай Дзям'янаўнай Кужырынавай (у тым шлюбе нарадзіліся сын Якаў і дачка Алена), атрымаў у пасаг дом на Падоле. Але стаць кіеўскім мешчанінам не мог, бо фармальна быў падданым Рэчы Паспалітай. Тады ён і напісаў 15 сакавіка (паводле старога стылю) 1782 г. чалабітную, у якой прасіў дазволу скласці прысягу царыцы Кацярыне ІІ і, верагодна, атрымаў яго. На гэтым звесткі пра Сцяпана Шпака (Шпакоўскага) абрываюцца.

Гэта – маленькі эпізод з гісторыі кіеўскага мешчаніна канца XVIII ст., але ён яшчэ раз паказвае інтэнсіўнасць украінска-беларускіх стасункаў і ўжо таму выклікае зацікаўленне не толькі ў даследнікаў, але і ў шырокай чытацкай аўдыторыі.

*Юрый МЫЦЫК,*
*доктар гістарычных навук,*
*прафесар,*
*г. Кіеў*



# Год 1914-ы: погляд з 2014-га

## Новая кніга аб падзеях Першай сусветнай вайны

***Нядаўна ў брэсцкім выдавецтве «Альтэрнатыва» пабачыла свет кніга «Выганашчы ў Вялікай вайне», прысвечаная падзеям Першай сусветнай. Яе аўтар – супрацоўнік Палескага аграрна-экалагічнага інстытута Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат біялагічных навук Віктар Дзямянчык. Кніга напісаная ў навукова-папулярным стылі на аснове разнастайных літаратурных крыніцаў, архіўных матэрыялаў і ўласных даследаванняў аўтара, які, дарэчы, нарадзіўся ў гэтай вёсцы.***




Найперш кніга прысвечаная падзеям 100-гадовай даўніны, якія адбываліся тады ў наваколлі палескай вёскі Выганашчы (сёння гэта Івацэвіцкі раён), якая дала назву вядомаму Выганаўскаму возеру і не менш вядомым непраходным балотам на Чарнаморска-Балтыйскім водападзеле. Хочацца прыгадаць, што ў часы Першай сусветнай вайны вёска на тры гады была падзеленая лініяй фронту паміж рускімі і нямецкімі войскамі. Адметна, што тут за гады вайны на адносна невялікай тэрыторыі нямецкімі салдатамі было ўзведзенае велізарнае мноства бетонных абарончых збудаванняў, якія сёння аб'яднаныя ў перспектыўны турыстычны аб'ект «Выганашчанская фартэцыя».

Віктару Трафімавічу вельмі ўдала атрымалася распавесці чытачам не толькі аб пачатку вайны на беларускіх землях, адыходзе рускіх войскаў, вывазе мясцовага насельніцтва ў бежанцы, баявых дзеяннях на лініі фронту ўздоўж Агінскага канала, але, з пункту гледжання вучонага-біёлага і эколага, удалося паразважаць, як прыродныя ўмовы Палесся паўплывалі на стратэгію і тактыку баявых дзеянняў і франтавое жыццё нямецкіх і рускіх салдатаў. Вельмі многа ў кнізе расказваецца і аб жыццёвай мудрасці палешукоў тых часоў, іх гарманічным суіснаванні з прыродай і, як вынік, аб здзіўленні нямецкіх салдатаў і афіцэраў гэтымі палескімі дзівосамі.

У кнізе распавядаецца і аб многіх іншых малавядомых, але надзвычай цікавых падзеях Першай сусветнай вайны на ўчастку фронту ўздоўж Агінскага канала. Багата ў кнізе і разнастайных, раней не вядомых, фотаздымкаў тых часоў і картаграфічнага матэрыялу.

Варта прыгадаць, што В. Дзямянчык у гэтай кнізе праявіў сябе не толькі як прафесійны вучоны-біёлаг, але і як выдатны гісторык, краязнаўца і ўлюбёны ў свой край чалавек.

*Аляксандр МЯЛІК*

## Дзе варта пабываць

***Літаратурна-мастацкі альманах «Тэксты», які выходзіць ужо 10 гадоў, стаў адметнасцю на літаратурнай ніве нашай краіны. З гэтай нагоды Арт-суполка імя Тадэвуша Рэйтана і выдавецтва «Галіяфы» ладзяць імпрэзу, якая пройдзе ў мінскім Палацы мастацтва 27 кастрычніка, пачатак а 19-й гадзіне.***




У юбілейным пятым нумары «Тэкстаў» змешчаныя вынікі літаратурнага конкурсу імя Тадэвуша Рэйтана, абвешчанага летась. Упершыню на землях былога Вялікага Княства Літоўскага выйшаў зборнік працаў навукоўцаў і літаратараў, прысвечаны вялікаму сыну беларускай зямлі, герою знакамітага Надзвычайнага сейма 1773 г. Падобнага не было раней і па-за межамі Беларусі. Імя ліцвіна-беларуса наваградскага падкаморага Т. Рэйтана, які ў тыя трагічныя дні стаў на чале невялікага кола патрыятычных дэпутатаў сейма (сярод іх Самойла Корсак з Наваградка, Станіслаў Багушэвіч-Мінькоўскі з Мінска), што былі супраць першага падзелу Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў – ВКЛ і Кароны Польскай, – назаўсёды стала сімвалам шчырага, нязломнага патрыятызму.

У гонар Т. Рэйтана, як найбольш яркай і трагічнай асобы, якая паказала свету прыклад выключнай грамадзянскай мужнасці перад тварам смяротнай небяспекі, у Ляхавічах, Баранавічах, Навагрудку і Мінску называлі школы, надавалі вуліцам яго імя, адкрывалі помнікі і памятныя дошкі. Вядомыя ліцьвіны XIX ст. – Адам Міцкевіч, Юліян Нямцэвіч, Генрык Жавускі, Францішак Смуглевіч і іншыя – прысвячалі яму літаратурныя і мастацкія творы. Мінуў час, і ў XX ст. на радзіме памяць аб ім разам з гістарычнай памяццю аб падзеях XVIII ст. прыйшла ў заняпад.

Ладзячы прэзентацыю, арганізатары звяртаюць увагу на неабходнасць вяртання ў нацыянальны гістарычны пантэон імёнаў Рэйтана, Корсака, Багушэвіча, усебаковага ўшанавання іх памяці, а таксама на лёс радавога маёнтка Рэйтанаў у в. Грушаўка на Ляхавіччыне. Ініцыятары імпрэзы мяркуюць, што ў сядзібе мусіць паўстаць дзяржаўны мемарыяльны музей Тадэвуша Рэйтана; гэтую думку падзяляюць прафесар Адам Мальдзіс, старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца і шмат іншых дзеячаў культуры Беларусі. Сярод прадстаўнікоў роду былі і іншыя вартыя ўвагі асобы – пісьменнікі Станіслаў і Ганна Рэйтаны, асветнікі і дабрадзеі мясцовых людзей (апошнія з роду) Язэп і Аліна Рэйтаны ды іншыя. Таму гісторыка-культурны комплекс агульнанацыянальнага значэння на базе Грушаўскай сядзібы быў бы вельмі цікавым і прыцягальным для ўсёй Беларусі.

Пад час мерапрыемства прысутныя пабачаць дакументальныя стужкі «Тадэвуш Рэйтан: Беларускі Дон-Кіхот» (АНТ) і «Аліна Рэйтан. Апошняя з роду» (рэжысёр А. Ясінская), таксама будзе дэманстравацца выстаўка «Род Рэйтанаў. Асобы і падзеі».

*Зміцер ЮРКЕВІЧ,*
*Зміцер ВІШНЁЎ*



*Флігель (мураванка), у якім жыў Т. Рэйтан*

# Лёс магільнага помніка

Добрая і разам з тым маркотная прыказка сведчыць: «Час раскідваць камяні і час збіраць». На Дзяржыншчыне збіранне камянёў набыло за апошнія гады амаль прамы сэнс: пачалі будавацца і аднаўляцца разбураныя храмы, прыводзяцца ў парадак занядбаныя, месцамі разбураныя вандаламі, могілкі. Разам з гэтым адраджаецца духоўнасць нашых суайчыннікаў, вяртаецца памяць аб мінулым, якую не змаглі да канца знішчыць бальшавікі.

Дастаткова прыгадаць зруйнаваны ў савецкія часы і нядаўна нанава адбудаваны Свята-Мікалаеўскі храм у вёсцы Станькава. А нядаўна былі прыведзеныя ў парадак занядбаныя, парослыя хмызняком і разбураныя чорнымі капальнікамі так званыя «панскія» могілкі ў вёсцы Дзягільна, дзе пахаваны Адольф Янушкевіч з родзічамі. Ёсць шмат і іншых прыкладаў.

Той, хто хоць аднойчы праязджаў па дарозе Дзяржынск – Рубяжэвічы, не мог не звярнуць увагу на каплічку, што стаіць на ўзгорку і мае дачыненне да вядомых братоў Дыбоўскіх. Побач з ёю ляжала напалову закапаная ў зямлю чорная мармуровая пліта. Шэсць гадоў таму мне давялося быць у гэтым месцы, калі збіраў матэрыял для газеты пра жыццё Дыбоўскіх. Калі б пліта не была такой цяжкай, яе даўно б выкарысталі «прадпрымальныя» людзі з навакольных вёсак дзеля падмурка. Ад старажылаў вёскі Баравое яе ўраджэнка Святлана Дзянісава, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», даведалася, што да вайны двое вяскоўцаў у пошуках скарбаў раскапалі на гэтым пагорку магілу і наткнуліся на цагляны мур, пад якім ляжалі рэшткі нябожчыка. Адзін з тых людзей склаў дома з чырвонай цэглы склепа печ. Калі пачалася вайна, ён прыслугоўваў немцам. Аднойчы партызаны шукалі яго, каб адпомсціць, дык мужчына схаваўся ў печы. І менавіта ў печы, зробленай з магільнай цэглы, ён атрымаў партызанскую кулю.

Упадзіна і закапаная мармуровая пліта, што засталіся ад магілы, захаваліся, але, на вялікі жаль, ніхто не спрабаваў даведацца аб паходжанні самой пліты. Таямніцу гэтай магілы раскрыла, нягледзячы на сваю занятасць, Святлана Дзянісава. Неяк, пасвячы статак кароў аднавяскоўцаў, яна паспрабавала прачытаць амаль сцёртыя словы. «Прохожий, вспомни о кончине своей, помолись о душе моей» – абвяшчаў надпіс на бакавой паверхні пліты. А на верхняй частцы пліты можна было прачытаць вершаваную эпітафію: «Вот он лежит, Отец наш милый, но он не наш уже, увы. Умолк язык его унылый, уста сомкнулись от молвы. Но наше сердце помнит, знает, что наши души его спасают. Привет из гроба вам, друзья, привет тебе, семья моя». С. Дзянісава зразумела, што гэта не надмагільная пліта, а помнік, і на другім яго баку павінна быць прозвішча нябожчыка. Да даследванняў яна далучыла свайго бацьку, дэпутата Бараўскога сельскага Савета Дзмітрыя Дзянісава. Ён знайшоў тэхніку, і пры дапамозе яе пліта была павернутая на другі бок. Надпіс на ім сведчыў: «Настоятель Рудицкой церкви Владимир Елисеевич Квятковский. 1849 года 13 февраля, 1908 года 29 ноября».



Выступае Святлана Дзянісава



Асвячэнне магілы

Святлана Дзянісава вырашыла больш даведацца пра святара і яго сям'ю. Шмат звестак атрымала ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, дапамагла ёй і былая загадчыца Бараўскога гісторыка-краязнаўчага музея, краязнаўца Тамара Клепікава. Высветлілася, што святар Уладзімір Квяткоўскі нарадзіўся ў вёсцы Морач Слуцкага павета. У 1871 годзе ён скончыў Мінскую духоўную семінарыю, а настаяцелем Рудзіцкай царквы быў з 1874 года. Між іншым, сама царква – Рудзіцкі праваслаўны прыход Пераўтварэння Гасподня – некалі стаяла на тым жа ўзгорку, дзе потым быў пахаваны святар. Цяпер пра гэта нагадваюць толькі паглыбленні ад колішняга падмурка.

За сваю стараннасць святар У. Квяткоўскі быў адзначаны вельмі высокай на той час узнагародай – Імператарскім ордэнам Святой Анны. У яго і матушкі Марыі Міхайлаўны было трое сыноў і дзве дочкі. Адзін з сыноў, Іосіф, служыў святаром у Талачыне. У 1937 годзе быў арыштаваны і расстраляны ў Аршанскай турме, а ў 1989 годзе рэабілітаваны. Па шляху бацькі і брата Іосіфа пайшоў і сын Сяргей. Дачка Анастасія працавала настаўніцай у Койданаўскай царкоўна-прыходскай школе.

Калі ўзнікла пытанне аб узнаўленні магілы святара, грошы на дабрачынную справу ахвяравалі жыхары вёсак Баравое, Новая Рудзіца, Бакінава, Касілавічы, а ў зборы сродкаў дапамагалі загадчыца Бараўскай сельскай бібліятэкі Ніна Чорная і маці Святланы Дзянісавай Любоў Уладзіміраўна. Усталяваннем помніка і добраўпарадкаваннем магілы займаліся работнікі фірмы рытуальных паслугаў КСА-сервіс «Каменны двор», якой кіруе Сяргей Кумейша.

Адкрыццё помніка і асвячэнне магілы адбылося ў адзін з сонечных кастрычніцкіх дзён. Присутнічала блізу сямідзесяці чалавек, многія прыйшлі разам з дзецьмі. Выступіла старшыня Бараўскога сельскага Савета Ала Кананенка. Святлана Дзянісава падзякавала ўсім землякам, якія спрычыніліся да гэтай справы, расказала пра пошукі звестак аб жыцці святара У. Квяткоўскага. Яна адзначыла, што прыйдзе час, і на старым месцы будзе пабудаваны новы храм і адрэстаўраваная каплічка Дыбоўскіх. Затым святар Дзяржынскай Свята-Пакроўскай царквы айцец Павел здзейсніў малебен і асвяціў магілу, да помніка ўсклалі кветкі. Усё гэта – сведчанне таго, што ў наш складаны час не зачарствелі душы і сэрцы, людзі заўсёды гатовыя адгукнуцца на добрыя справы. А значыць – будзе жыць Беларусь і яе народ.



Урачыстасць каля сценаў капліцы

ЛявонЦЕЛЕШ
Фота аўтара

# Музычнае падарожжа па Беларусі

***У Мінску працуе ўнікальная ўстанова – «Спецыяльная гарадская бібліятэка для сляпых», створаная ў 2002 г. Гэта адзіная ў горадзе бібліятэка для людзей з абмежаванымі магчымасцямі зроку. Тут сабраныя не толькі звычайныя для нас кнігі ды перыядычныя выданні, але і надрукаваныя шрыфтам Брайля, аўдыякнігі на розных носьбітах.***

15 кастрычніка, у Міжнародны дзень белага кія, беларускі гурт «Like a Gossamer» перадаў гарадской бібліятэцы для сляпых кампакт-дыскі свайго альбома «Kliatva viernasci».

Нагадаем, што пра гурт і альбом «Краязнаўчая газета» пісала неаднаразова; у музычным цыкле з 20 кампазіцыяў песні чаргуюцца з шумавымі ландшафтнымі замалёўкамі (soundscape composition) – пазнавальнымі гукамі навакольнага асяроддзя (русалка, якая жыве ў возеры Свіцязь; радасны натоўп на плошчы старажытнага Полацка; жандары, якія маршыруюць па віленскім бруку), што будзяць уяўленне слухача і выклікаюць у яго адпаведныя асацыяцыі. Іх для альбома стварыў саўнддызайнер з Санкт-Пецярбурга Арцём Бусел. Міжнародны арт-праект прысвечаны малавядомым легендам Беларусі, а таксама выбітным дзеячам беларускай гісторыі. Ажыццёўлены дзякуючы ініцыятыве «Кірмаш праектаў».


Спецыяльная бібліятэка чакае

«Праз музычна-гукавыя карціны і кампазіцыі альбома “Kliatva viernasci” мы хочам паспрабаваць паказаць Беларусь тым, хто пазбаўлены магчымасці падарожнічаць і бачыць яе на свае вочы, – кажа франтмэн гурта Алесь Акульчык. – Спадзяемся, музыка “Like a Gossamer” раскажа невідушчым і людзям са слабым зрокам – асабліва маладым – пра нашу Радзіму, яе гісторыю і традыцыі – гэтаксама, як гук ад удару кія аб брук дапамагае ім чуць і адчуваць наваколле».




*Уласная інфармацыя*

# Гаспадар жытнёвага дагледжанага поля

## *Да 100-годдзя з дня нараджэння Міколы Жука*

Жыў на свеце чалавек. Жыў спрадвечнымі вясковымі клопатамі, настаўнічаў у школе, а яшчэ – пісаў вершы.

*Багатым не зайздросціў я ніколі.*
*Я сам багач. Бо мой – увесь прастор:*
*Жытнёвае дагледжанае поле,*
*Квяцісты луг, шумлівы, гулкі бор.*

Багачом называў сябе Мікалай Андрэевіч Жук, чыя жыццёвая дарога пачалася ў вёсцы Паўстынь Слуцкага раёна 24 кастрычніка 1914 года. Дарога, не пазбаўленая скрухі і шматлікіх выпрабаванняў. Маці сваю ён не памятаў, бо быў маленькі, калі Алеся Іванаўна памерла, маючы ад нараджэння ўсяго 28 гадоў. Бацька, Андрэй Самуілавіч, усё жыццё працаваў на зямлі, прывучыў да гэтага і сына. А яшчэ пад уплывам бацькавага захаплення кнігамі Мікола далучыўся да цудоўнага свету паэзіі, зачараваўся «музыкай паэтычнага радка».

Пасля заканчэння пачатковай школы ў Паўстыні Мікола працаваў на торфараспрацоўках, на чыгунцы, ды і бацьку трэба было дапамагаць па гаспадарцы. Але ж так хацелася вучыцца! І ён вечарамі хадзіў за пяць кіламетраў у гарадскі пасёлак Урэчча (цяпер у Любанскім раёне) у школу калгаснай моладзі. Тады ўпершыню і праявіліся яго літаратурныя здольнасці. Можаце ўявіць пачуцці, настрой сціплага вясковага хлапчука, сачыненне якога, змешчанае ў школьнай насценгазеце, заўважыў Міхась Лынькоў – ужо вядомы на той час пісьменнік? З 1933 года, пасля заканчэння настаўніцкіх курсаў пры школе, М. Жук працаваў у Грэскім раёне, спрабаваў сябе ў паэзіі. А калі летам 1935 года ён быў на вайсковых зборах у Мінску, ураджанні ад горада вылiліся ў некалькі вершаў. Адзін з іх («Мінску») у тым жа 1935-м надрукавала газета «Літаратура і мастацтва».

На вершы Міколы Жука звярнулі ўвагу, а пісьменнік Мікола Хведаровіч меў грунтоўную размову з маладым аўтарам, падахвоціў яго вучыцца. Увосень 1935 года з накіраваннем Саюза пісьменнікаў БССР Мікола Жук паступіў на рабфак пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, а праз два гады ён – студэнт літаратурнага аддзялення Мінскага педагагічнага інстытута імя Максіма Горкага. Адзін за адным з'яўляюцца вершы ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Звязда», у часопісе «Полымя рэвалюцыі», бывала, што і побач з творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова. Тады ж сустрэў сваю каханую – адзіную на ўсё жыццё Паліну Пятроўну. Колькі было планаў, творчых задумаў, аднак апошні экзамен за інстытут, прызначаны на 22 чэрвеня 1941 года, давялося здаваць пасля вайны.

З палаючага Мінска маладыя муж і жонка вярнуліся на Случчыну. Ужо ў чэрвені 1941 года напісаў верш «Паўшым». З дзённіка паэта: *«Пісаць вершы супраць фашыстаў клікалі крывавыя падзеі кожнага дня. Усё напісанае трэба было добра хаваць: калі такое пападзе ў рукі фашыстаў, кулі ці вісельні не мінаваць... Вершы складваліся ў галаве і, не запісаныя на паперу, часта гінулі бясследна»*. Вера ў перамогу ніколі не пакідала патрыёта, і неўзабаве ён пачаў выконваць нялёгкую і рызыкоўную ролю партызанскага сувязнога. Калі ж сям'і (была ўжо маленькая дачка) заставацца ў вёсцы стала небяспечна, яе пераправілі ў партызанскі атрад.

Ў Любанскім раёне ў атрадзе імя Р.І. Катоўскага 64-й партызанскай брыгады імя В.П. Чкалава са зброяй у руках Мікалай Андрэевіч Жук змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А ў перапынках паміж баямі і паходамі рука цягнулася да алоўка, каб запісаць радкі, што ішлі ад самага сэрца. Пад многімі вершамі таго часу ёсць пазнакі: партызанскі атрад імя Катоўскага; блакаваная зона, Салавуцк; Куценка; партызанская зона, Азярное... Ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «Партызану Айчыннай вайны» і іншымі ўзнагародамі адзначаны уклад М. Жука ў барацьбу за свабоду і незалежнасць Радзімы. Вайна, гібель баявых таварышаў,


М. Жук

сваіх братоў, народная трагедыя настолькі балюча прайшлі праз душу Міколы Жука, што ваенная тэма стала адной з галоўных у яго творчасці. Ён меў поўнае права сказаць:

*Я ўсё зрабіў, што толькі мог,*
*Святое клятвы не парушыў,*
*А водбліск даўніх тых дарог*
*Мне й сёння азарае душу.*

Увосень 1944 года М. Жука накіравалі працаваць настаўнікам у Вясейскую сярэднюю школу Слуцкага раёна. Потым трынаццаць гадоў настаўнічаў у Старцавічах (цяпер Знамя) на Случчыне, а з 1959 года – ва Урэцкай сярэдняй школе №1 Любанскага раёна. З гэтага ж часу ён жыў у вёсцы Мерашына Слуцкага раёна. За педагагічную дзейнасць Мікалай Жук узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай асветы». А яшчэ – ён быў любімым настаўнікам для многіх вучняў. Улюбёны ў літаратуру, ён часта выходзіў за рамкі школьнай праграмы, расказам пра якога-небудзь літаратурнага героя мог зацікавіць самых абыякавых. А на факультатыўныя заняткі па літаратуры, якія праводзіў Мікалай Андрэевіч, прыходзілі нават тыя вучні, якіх ніяк нельга было назваць выдатнікамі. Пра гэта пішу не з чужых словаў, бо вучыўся ў класе, дзе М. Жук быў класным кіраўніком.

Дамо слова аднаму з вучняў М. Жука – пісьменніку Паўлу Місько: *«Па ўсёй краіне раз'ехаліся тысячы яго вучняў, выхаванцаў (амаль паўвека педагагічнай працы!). І яны, яго духоўныя нашчадкі, панеслі з сабою любоў да роднай зямлі, яе мовы і звычаяў, і многія з іх таксама сталі настаўнікамі, каб сеяць разумнае, добрае, вечнае і клапаціцца, каб пасеянае ўзыходзіла рунела, каб давала важкія каласы»*.

Юнацкае захапленне паэзіяй Мікола Жук пранёс праз усё жыццё. Ён пісаў вершы, паэмы, апавяданні, лірычныя замалёўкі. На жаль, пісаў «у стол», амаль нікому не паказваў напісанае. Сціпласць, патрабавальнасць да сябе прымушала аўтара пастаянна папраўляць, удасканальваць свае творы. А іх станавілася ўсё больш і больш. Мікалай Андрэевіч нібы спяшаўся выказаць тое, што яго хвалявала. У яго вершах – і замілаванне роднай прыродай, і пазіцыя грамадзяніна, і трывога за заўтрашні дзень, і многае іншае.

Вершы нашага земляка ў 1990-х гадах друкавалі газеты «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Во славу Родины», часопіс «Полымя», некаторыя іншыя выданні. А ў канцы 1995 года ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці тыражом у 1 000 экзэмпляраў выйшаў у свет паэтычны зборнік Міколы Жука «Ля падножжа маіх святынь». У ім змешчаныя 83 творы, аб'яднаныя ў чатыры раздзелы: «Паклон маладосці», «Водгулле вялікай вайны», «Цяплом роднай зямлі», «Насустрач будучыні». У прадмове да кнігі паэт Уладзімір Паўлаў напісаў: *«Па свайму характару, па тых патрабаваннях, якія прад'яўляе Мікола Жук да паэтычнага слова, ён не стукаўся ў выдавецкія дзверы, не шукаў сабе спагадлівага ўдумнага рэдактара. Іначай гэтая сустрэча з чытачом магла б адбыцца і трыццаць, і сорак гадоў таму»*. І ўсё ж сустрэча адбылася.

На вялікі жаль, першы і адзіны зборнік сваіх вершаў аўтар так і не патрымаў у руках. 14 кастрычніка 1995 года Мікалая Жука не стала. Але ж – «напісанае застаецца». Напісанае чалавекам, які любіў родную старонку, яе людзей, які спаўна выканаў свой грамадзянскі абавязак.

*Анатоль ЖУК, г. Слуцк*

Георгій ШЭЎМЕР

## Погляд

Згодна з агульназемскім прывілеем ад 20 лютага 1387 года, выдадзеным вялікім князем ВКЛ Ягайлам, калі абвяшчалася «пагоня», у пераследаванні ворага павінны былі ўдзельнічаць усе мужчыны, здольныя насіць зброю. Абвяшчэнне пагоні закранала ўсіх, і пераследаванне ворага для вызвалення палонных і пакарання рабаўнікоў даводзілася арганізоўваць вельмі часта. Гэты кліч (або заклік) на доўгі час раптоўна змяняў усё жыццё людзей, падпарадкоўваў яго адзінай для ўсіх мэце. Відаць, таму гэтае слова і пачало атаясамлівацца з сімвалам дзяржавы, з яе гербам, з тымі людзьмі, якім гэты сімвал быў блізкі і зразумелы. Тым больш што герб – вершнік на кані з шабляй у руцэ – такому яго разуменню цалкам адпавядаў.

Дарэчы, гэта вельмі рэдка – а нехта скажа, што і невыпадкова – калі сімвалы дзяржавы стварае сама гісторыя народа. У гэтым выпадку яны лепш за ўсё адпавядаюць тым мэтам, для якіх і прызначаныя: аб'ядноўваць людзей, дапамагаючы ім на падставе мінулага шукаць паразуменне і кампрамісы ў сучасным, дапамагаючы ім упэўнена глядзець у будучыню. Адмаўляюцца ад такіх сімвалаў толькі асобы недалёкія, якія не бачаць нічога, акрамя сваіх будзённых турботаў, толькі людзі, якія не дараслі да таго, каб зваццa нацыяй. Ці ж мы такія?!.

* * *

*Ляцеў над полем конь буланы*
*І нёс на ўпененай спіне*
*Ганца, што быў і нечаканы,*
*І ўсім знаёмы ў даўніне.*

*Сустрэўшы вёскі ці сядзібы,*
*Галоп ганец той прыпыняў*
*І мітусні будзённай хібы*
*Адзіным словам зацмяваў.*

*«ПАГОНЯ» – бы віхор з былога –*
*Ляцела слова над зямлёй,*
*Якім ганец з часоў Міндоўга*
*Склікаў людзей на жорсткі бой.*

*Хто чуў кліч гэты ў тых прасторах,*
*Якімі вершнік пралятаў,*
*Час не гублялі ў доўгіх зборах,*
*Дзе б ён ваякаў не застаў:*

*Харугвы мусілі збірацца*
*Да месцаў, знаных іх байцам,*
*Каб у пагоню выпраўляцца*
*Услед няпрошаным гасцям.*

*Ў атаку вершнікі ляцелі*
*На звыклых з сечай скакунах,*
*І шаблі срэбрам зіхацелі*
*У іх, тых вершнікаў, руках…*

*І гэты кліч, што жыў з народам,*
*Зрабіўся сімвалам зямлі,*
*Той, што насупраць перашкодам,*
*Нашчадкам продкі зберaглі.*

*Зямлі, дзе мы блукаем сёння*
*Ў імгле бяздумнасці сляпой,*
*З якой ліцьвінскі кліч «ПАГОНЯ!»*
*Тых вырве, хто не здрадзіў ёй.*



Бы віхор з былога – нашыя мужныя продкі

*Традыцыі і сучаснасць*

# Сучасны фольк «Тінь Сонця» як люстэрка грамадства

### «Тінь Сонця» – «Грім в ковальні Бога», Кіеў, 2014, «Саме Так!»

Часам прыходзяць у галаў развагі пра парадоксы фанаграфічнага крызісу: чаму крамы наракаюць пра заняпад музычнай вытворчасці, а на канцэртах шчырыя меламаны таўкуцца ў шапіках музычнага мэрча па тавары, прысвечаныя улюбёным гуртам? Ці не таму, што лянота не дае «работнікам гандлю» прагі рухацца (кшталту «А ў вас ёсць…» – «Пасматрыце самі…»), а музычны бізнес ґрунтуецца на сталых зменах. Вось і кіеўскі фольк-метал гурт «Тінь Сонця» яшчэ пяток гадоў таму быў у рангу нейкага таямнічага адкрыцця выключна фанатычных прыхільнікаў украінскага фольк-року, а сёння ягонае імя ў якасці хэдлайнэра, галоўнага выступоўцы, на афішах ґарантуе імпрэзе прэстыжны статус і масавую прывабнасць. Бадай, прэса йдзе больш жвава ў асвятленні з'яваў музычнага свету, таму пра «Тінь Сонця» хто толькі не пісаў у нас («Переходный возраст», «Товарищ», «Верасень», «Маладосць», «Бярозка»). Не засталася ўбаку й наша «Краязнаўчая ґазета», якая летась у жніўні аналізавала альбом «Танець серця». Тады нас уражвалі беларускія кантэксты, што трапляюць у сферу творчасці ўкраінскіх музыкаў з альбома ў альбом. А ўсяго праз паўгода кіяўляне выдалі сваю чацвертую паўнафарматную кружэлку, якую назвалі «Грім у ковальні Бога».

Як адзначыў музычны аналітык тыднёвіка «Новы час» Анатоль Мяльгуй, «нягледзячы на цяперашнія драматычныя адценні ў музыцы й тэкстах гурта, якія сталі вынікам траґічных падзеяў на радзіме, кампазіцыі захавалі меладычнасць і шчырасць, а таксама вытанчанасць у аранжыроўках».

Асабіста я ў кулуарных гутарках перапоўненага мінскага клуба «Re:Public» спярша зайздросціў аператыўным пампоўшчыкам з інтэрнэту, якія на першым у Беларусі прэзентацыйным канцэрце гэтай кружэлкі жвава абмяркоўвалі праґраму новага рэлізу: «Найбольш уразіла песня «Збої» – такая злая, аґрэсіўная! Раз за разам яе слухаю, так адпавядае настрою ў грамадстве і ў душы».

Аднак, першае маё праслухоўванне ў якасным гучанні выявіла, што акурат гэты твор кінуўся на ўвагу не адразу. Я проста праміную яго, уражаны, як бы парадаксальна гэта ні гучала, дынамізмам павольных месцаў на старце й фінале песні «Меч Арея». Гэта пра нейкую славянскую чароўную рэліквію, якую «трымалі Тур і Святаслаў, трымалі віцязі, князі, трымалі рыцары-гетманы, абараняючы святую Русь, а зараз ён у тваёй руцэ». Накшталт кельцкіх леґендаў пра меч у камяні або Эскалібур. У тэкставай версіі магутна працінае душу энергія рэфрэну, а напрыканцы кружэлкі інструментал уражвае агульным шармам музычных аб'ёмаў (праўда, гэта ў тым выпадку, калі вы слухаеце не ў камп'ютарных навушніках, а на апаратуры hi-end або хаця б hi-fi).





Гурт «Тінь Сонця» на сцэне мінскага клуба «Re:Public»

А пасля твору «Коли на серці сумно» я дык і ўвогуле пра меламанскія спрэчкі забыўся:

*Коли на серці сумно*
*і жити вже не в кайф є,*
*Виходжу подивитись,*
*як вітер з морем грає,*
*Немов зійшлось козацтво*
*у смертельному бою*
*За волю побратимів, за святу*
*стражденну матінку свою.*

Не чакайце тут зануднай мелодыі суму, бо твор акурат аж падкідае слухацкія эмоцыі неверагоднай фантазіяй рытмічнага малюнка. Дый увогуле альбом «Грім у ковальні Бога» вызначаецца разнастайным багаццем рытмічных малюнкаў канцэптуальна ўпрасаваных у яго твораў: сімфарокавыя гармоніі ў «Сонцечоловік» (як не прыгадаць купалаўскае «Паўстань з народу нашага, прарок» у блэк-металёвых акордах «Wartha»), фолькава-баладныя «Косарі», сімбіёз фолькавай баладнасці з маршавымі настроямі ў «Народна війна», суровы металраманс «Вітряк» («калі маеш крылы, дык лятаці мусіш ты»), загукальны экстрым араторыі «Дикі гуси» (бо «вырушайма насустрач вясне»), стылёвая джаз-меланхолія «Додому»…

Свежыя палітычныя рэаліі чуюцца ў песні «Ніколи не плач» («Раз'ятраны стэп, акроплены снег Юнацкай крывёй тых, хто спаці не мог – Па наша ідуць шалёныя псы, І ім не шкада чароўнай красы»).





З другога-трэцяга разу заўважыў, што металкоравыя рыфы кампазіцыі «Збої», прызнацца, і мне выявілі нейкую творчую азлобленасць на «сабачую дарогу», на збой у «шпілевай карце» (казырнай), але ж хіба аптымістычныя словы «і прарэжацца песня скрозь блевацінне» наталяюць слухача злосцю, а не пазітывам? Хутчэй тут папярэджанне тым, у каго «замерзлі ў горле малітва і клятва», бо калі даеш клятву, мусіш выканаць. А не – дык застрэлься (бо настаў «час рахаваць словы і кулі»). Мо' насамрэч суровая песенька… Але яна й пра лёс музыкі ў час грамадскіх катаклізмаў, ягонае пакліканне, самаахвярнасць («Пальцы ў мяса крывавяцца ў скрыпаля, Пакуль стогне і курчыцца наша зямля»). Быў жа выпадак, калі лідэр «Тінь Сонця» атрымаў удар ад тых, каму шчыра верыў. Дык хутчэй гэта боль, а не злоба.

Склад гурта «Тінь Сонця», які працаваў у студыі «Soncesvit» над альбомам «Грім у ковальні Бога», амаль не змяніўся: Сэргій Васылюк, вакал, акустычная ґітара, ён і асноўны аўтар музыкі і тэкстаў; Іван Лузан, бандура, клавішныя, сапілка, зямля; Руслан Мікаэлян, ґітара; Мікола Лузан, ґітара; Іван Грыгарак, бас-ґітара; Валадымыр Хаврук, бубны. Зноў далучалася скрыпачка Соня Рагальская ў «Касарах» і «Ніколі не плач».

Крыху ваяўнічы настрой вонкавага дызайну (меч нараджаецца ў кавальні Бога), бадай, падказаны не толькі пэўнай палітычнай сітуацыяй ва Украіне, але й стылістычнымі патрабаваннямі рамантычна-геройскіх тэмаў песень, падказаных фальклорнымі леґендамі. Варта дадаць, што тыя розныя леґенды фармуюцца не ў банальную складанку, а ў цэльны сюжэт, што змацоўвае й агульная назва для ўсіх твораў (загалоўкам альбому сталі словы з песні культавага барда Васіля Лютага «Меч Арея»). Гэта сюіта, дзе галоўную тэму шукаць не варта, бо моц у цэласці. Удалося скласці й настраёвую дынаміку гэтай сюіты.

*Вітаўт МАРТЫНЕНКА, музычны крытык*

## Лістапад

**«Алеся»** (Мінск; 1924), **штомесячны масава-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс** – 90 гадоў з пачатку выдання (да 1995 г. называўся «Работніца і сялянка»).

**1 – Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла Рэспублікі Беларусь імя Р.Р. Шырмы** (Мінск; 1939), заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь – 75 гадоў з часу стварэння.

**1 – Шэлехаў Міхаіл Міхайлавіч** (1954, Столінскі р-н), паэт, кінасцэнарыст, драматург, публіцыст, заслужаны журналіст Беларусі – 60 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Максім Лужанін** (сапр. **Каратай Аляксандр Амвросьевіч**; 1909, Слуцкі пав. – 2001), беларускі паэт, празаік, кінадраматург, перакладчык, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння.

**2 – Стаброўскі Іосіф Іосіфавіч** (1869, Слонім – 1968), вучоны-археолаг, краязнаўца, член-карэспандэнт Віленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага таварыства і Яраслаўскага археалагічнага таварыства, заснавальнік аднаго са старэйшых у Беларусі краязнаўчых музеяў (Слонім) – 145 гадоў з дня нараджэння.

**3 – Леановіч Павел Антонавіч** (1914 – 1943), беларускі празаік, публіцыст – 100 гадоў з дня нараджэння.

**4 – Ліхтаровіч Леанард Георгіевіч (1919** – 1967), беларускі мастак-афарміцель, графік – 95 гадоў з дня нараджэння.

**4 – Палякоў Юрый Георгіевіч** (1944 – 2004), беларускі скульптар – 70 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Алоўнікаў Ігар Уладзіміравіч** (1954, Мінск), піяніст, арганіст, педагог, народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994) – 60 гадоў з дня нараджэння.

**5 – Бялыніцкі-Біруля Аляксей Андрэевіч** (1864, Аршанскі р-н – 1937), вучоны ў галіне заалогіі і заагеаграфіі, падарожнік, член-карэспандэнт АН СССР, імя якога носяць заліў і гара на Таймыры – 150 гадоў з дня нараджэння.

**5 – «Салавей»** (Мінск; 1939), балет М.Я. Крошнера, першы нацыянальны балет – 75 гадоў з часу прэм'еры.

**5 – Хадасевіч-Лежэ Надзея Пятроўна** (1904, Докшыцкі р-н – 1983), французская мастачка, аўтар прац у манументальным і станковым жывапісе, манументальна-дэкаратыўным мастацтве, грамадская дзячка, мецэнатка – 110 гадоў з дня нараджэння.

**6 – Гарулёў Мікалай Аляксандравіч** (1919 – 1980), беларускі празаік, драматург, паэт – 95 гадоў з дня нараджэння.

**7 – Гомельскі абласны краязнаўчы музей** (Гомель; 1919) – 95 гадоў з часу адкрыцця.

**7 – Мікуцкі Станіслаў Паўлавіч** (1814, Гродзенская губ. – 1890), мовазнаўца-славіст, фалькларыст, педагог – 200 гадоў з дня нараджэння.

**7 – Палескі абласны музей (цяпер Мазырскі краязнаўчы музей**; 1949) – 65 гадоў з пачатку працы.

**8 – Нарбут Тэадор (Фёдар Яўхімавіч**; 1784, Воранаўскі р-н – 1864), гісторык, археолаг, інжынер – 230 гадоў з дня нараджэння.

**8 – Ціхаміраў Клаўдзій Іванавіч** (1864 – 1929), педагог, гісторык, краязнаўца, дырэктар Свіслацкай і Полацкай настаўніцкіх семінарый (1903 – 1910), Віцебскага настаўніцкага інстытута (1910 – 1921) – 150 гадоў з дня нараджэння.

**10 – Курбека Іван Сцяпанавіч** (1934, Баранавіцкі р-н – 2009), паэт, літаратуразнаўца, музеязнаўца – 80 гадоў з дня нараджэння.

**10 – Радзівіл Мацей** (1749 – 1800), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, апошні кашталян віленскі, кампазітар, драматург – 265 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Заборскі Георгій Уладзіміравіч** (1909 – 1999), беларускі архітэктар, народны архітэктар СССР, заслужаны будаўнік Беларусі – 105 гадоў з дня нараджэння.

**11 – Матушэвіч Марцін** (1714, Берасцейскі пав. – 1773), дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, пісьменнік, мемуарыст, перакладчык – 300 гадоў з дня нараджэння.

**14 – «Минский голос»** (Мінск; 1909), штодзённая грамадска-палітычная газета – 105 гадоў з пачатку выхаду (выходзіла да 30 лістапада 1918 г.).

**15 – Слямнёў Міхаіл Аляксандравіч** (1939, Гарадоцкі р-н), вучоны-філосаф, дзяржаўны дзеяч, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік народнай адукацыі Беларусі, выдатнік асветы СССР – 75 гадоў з дня нараджэння.

**15 – Яворскі Мацвей Іванавіч** (1884 – 1937), вучоны-гісторык, акадэмік НАН Беларусі і АН Украіны – 130 гадоў з дня нараджэння.

**16 – Язэп Семяжон** (сапр. **Семяжонаў Іосіф Ігнатавіч**; 1914, Смалявіцкі р-н –1990), перакладчык, пісьменнік, крытык, заслужаны работнік культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1982) – 100 гадоў з дня нараджэння.

## Чым небяспечны абагравальнік

Калі пачынаюцца халады, супрацоўнікам пажарнай службы і ЦРАНС у прыватнасці даводзіцца чуць нямала наракання на тое, што ў інтэрнатах і разнастайных арганізацыях нельга карыстацца электрычнымі абагравальнікамі. Адна рэч, калі гэта тычыцца самаробак і прыбораў з адкрытымі спіралямі. Але чаму нельга выкарыстоўваць добрыя абагравальнікі заводскай зборкі? Тлумачэнне простае. З-за недахопу разетак у памяшканні іх часта падключаюць праз падаўжальнікі і сеткавыя фільтры, што можа стаць прычынай пажару.

У выпадку, калі вы ўсё ж карыстаецеся абагравальнікам, калі ласка, выконвайце наступныя парады:

– не стаўце прыбор на праходзе і ў тым месцы, дзе на яго можа нешта ўпасці;

– не выкарыстоўвайце электрапрыборы, каб сушыць на іх адзенне і абутак;

– не пакідайце абагравальнік без нагляду.

Калі вы сыходзіце з дому, выключайце ўсе электрапрыборы (акрамя халадзільніка) і вымайце шнуры з разетак. А на ўсялякі выпадак абмяняйцеся нумарамі тэлефонаў з суседзямі.

*Дзяніс ПРОЦЬКА,*
*начальнік ЦРАНС*
*г. Мінска*

## Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 39

***Уздоўж*:** **1**. Кумпячкі. **4**. Падолік. **8**. Харч. **9**. Гром. **11**. Асвяжэнне. **12**. Нясун. **14**. Спіна. **15**. Гадок. **19**. Хвіга. **20**. Сорам. **23**. Скабы. **24**. Косць. **26**. Удава. **30**. Зайдрасць. **32**. Куры. **33**. Табу. **34**. Ахвосце. **35**. Рукавіца.

***Упоперак*:** **1**. Каханне. **2**. Мора. **3**. Чыпсы. **5**. Дзень. **6**. Ігра. **7**. Ножкі. **10**. Міскі. **13**. Сівізна. **16**. Дабрата. **17**. Зад. **18**. Аса. **21**. Асцюк. **22**. Халтура. **25**. Сорак. **27**. Запас. **28**. Уціск. **29**. Грэх. **31**. Пані.



*Будзе семак гарбузовых на ўсю зіму*

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

***(Пачатак у № 1 за 2003 год)***

**НАРО́ДНАЕ ДЭКАРАТЫ́ЎНА-ЎЖЫТКО́ВАЕ МАСТА́ЦТВА** (*заканчэнне артыкула*). Асабліва значныя змены ў характары традыцыйнага народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва адбыліся ў савецкі час. Рост дабрабыту народа, насычэнне побыту таннымі прамысловымі рэчамі абясцэнілі многія традыцыйныя вырабы нар. майстроў. Народнае мастацтва перажыло перыяд пошукаў новых, адпаведных часу шляхоў развіцця, чаму спрыялі ўрадавыя пастановы аб мерах садзейнання саматужніцкай прамысловасці (1919, 1921), папулярызацыя нар. мастацтва ў друку, арганізацыя выставак. Выяўленню традыцыйных асяродкаў нар. мастацтва, дапамозе майстрам, збору ўзораў садзейнічала арганізацыя Дамоў народнай творчасці (канец 1930-х гг.). Паколькі ўтылітарная, практычная функцыя многіх узораў народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва абясцэнілася, быў узяты курс на развіццё іх мастацкіх якасцяў. У сувязі з інтэнсіўнай адбудовай савецкай вёскі шырока развіваюцца віды нар. мастацтва, звязаныя з аздабленнем жылля: архітэктурная разьба, мастацкае ткацтва, аплікацыя, выцінанкі, размалёўка, саломапляценне, разьба па дрэве і інш.

У наш час народнае дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва Беларусі развіваецца пераважна ў двух галоўных кірунках. Першы – бытаванне ў сваіх традыцыйных умовах, для задавальнення ўтылітарна-мастацкіх патрэбаў сучаснага побыту. Адны віды нар. мастацтва да канца XX ст. адышлі разам з колішнім побытам (саматканае адзенне, самаробная мэбля, набойка, пернікарства, медніцтва, берасцяныя вырабы, дываны маляваныя і інш.), іншыя істотна змянілі свой характар.

Утылітарны бок твораў нар. майстроў адыходзіць на другі план, узрастае іх дэкаратыўнасць, пашыраецца колеравая гама, развіваюцца новыя віды і матывы дэкору. Сёння вырабы нар. майстроў задавальняюць больш эстэтычныя, чым практычныя патрэбы, і скарыстоўваюцца пераважна ў якасці твораў мастацтва і сувеніраў. Развіваецца архітэктурны дэкор, мастацкае ткацтва, пляценне карункаў, разьбярства, працягваюць сваю дзейнасць некаторыя ганчарныя цэнтры: Гарадная Столінскага р-на, Поразава Свіслацкага р-на, Ружаны Пружанскага р-на і інш. Другі кірунак развіцця сучаснага народнага дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва звязаны з дзейнасцю мастацкіх промыслаў, арганізаваных дзяржавай. Здабыткамі гэтага віду мастацтва жывіцца прафесійнае дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва. Апошнім часам многія традыцыйныя віды ўжытковa-дэкаратыўнага мастацтва пачалі аднаўляць як паасобныя майстры, так і гуртуючыся ў адпаведныя суполкі (выцінанка, ткацтва, выраб паясоў, кавальства і г.д.), чаму спрые як зацікаўленне традыцыйным побытам беларусаў, так і рыцарскія клубы.



*Аканіцы «Добрай раніцы», Аляксандр Пракалучанка, г. Навапалацк (1972 г.)*

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скарабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры передруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 23.10.2014
Газета надрукавана ўдрукарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.
Заказ 902.
Тыраж 910 асобнікаў.